сфере использования благ цивилизации, облегчающих и делающих приятной ежедневную жизнь. Жаль только, что на дальнем плане житейских ожиданий и стремлений находится профилактическая деятельность, а средства физической культуры в этой сфере – признаваемые вербально – в практике постепенно исчезают [11]. Другой образец, образец физической формы, реализован по большей части в институциализированном виде: либо во время занятий в школе, либо во время занятий, готовящих к профессиональной деятельности (например, в полиции, армии, цирке, театре и т.д.). Он реализуется скорее как обязанность, нежели форма реализации спонтанных, свободных интересов. Поэтому этот образец апробирован большинством молодых людей, но скорее так, как апробируются например ценности труда (в основном, без особенного эмоционального вовлечения)

Главные институты воспитания (семья и школа), а также средства массовой коммуникации и специализированные организации по физической культуре концентрируются, прежде всего, на формировании утилитарного и агонистического образца. Остальные упоминаемые образцы (эстетический, гедонистический, гигиенический, а также аскетический) остаются делом «воспитывающего сообщества». Они достигаются скорее благодаря процессу социализации, нежели воспитанию в узком значении (т.е. посредством процесса намеренного воздействия). Это, вероятно, свидетельствует о существенном недоразвитии этих институтов в сфере профессиональной и физической культуры, а, следовательно, об их традиционализме, или даже скорее – анахронизме. Беспомощность школы и семьи, например, в реализации, современной программы воспитания здоровья, или сексуального воспитания остается, пожалуй, наиболее щекотливым явлением этого положения.

Ввиду существующей ситуации со здоровьем общества, становится неизбежным поднятие уровня осознания его важности, что связано, прежде всего, с просветительской деятельностью, ориентированной на смену принципов. О состоянии просвещения общества, а, следовательно, и о каждодневном поведении его членов свидетельствует уровень той деятельности, которая заключается в передаче молодому поколению знаний, ценностей, поступков, идеалов и жизненных целей.

Культурные образцы поведения благоприятствующего здоровью определены с одной стороны процессом первичной аккультурации и социализации, а с другой – прогрессом цивилизации и институциональной деятельностью. Эти модели поведения E.Roman определяет как *социально выявленные личностью способы сохранения ценностей, принятых в данной группе и обозначенных культурой этой группы как понятие «здоровье», представляющих неотъемлемый элемент культуры группы, который передается в процессе социализации* [12, 215]. Эти модели отражают сущностные аспекты социальной биографии и положения личности, стандартные для данного общества и его культуры. Целесообразное поведение, навыки, обычаи, позиции, ценности, признанные личностями и социальными группами, определяют то, как человек понимает здоровье, как его оценивает, как им распоряжается и как реагирует на здоровье других. Культурным компонентом моделей целесообразного поведения, несомненно, являются знания, связанные с проблемами здоровья, болезни, терапии, профилактики, компенсации, а, следовательно, знания, касающиеся прежде всего телесности человека.

### СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ


1. Osiński W. *Zarys teorii wychowania fizycznego*.- Poznań: Akademia Wychowania Fizycznego, 1996.- С. 49.
2. Fromm E. *Rewolucja nadziei*. Poznań: Dom Wydawniczy „Rebis", 2000.- С. 97, 99.
3. Giddens A. *Nowoczesność i tożsamość. „Ja" i społeczeństwo w epoce późnej nowoczesności*. Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN, 2001.- С. 137.
4. Znaniecki F. *Socjologia wychowania*.- Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1973.- Т. 1: Wychowujące społeczeństwo.- С. 221
5. Przewęda R. *Promocja zdrowia przez wychowanie fizyczne* // Promocja zdrowia / Ред. J.B. Karski.- Warszawa: Wydawnictwo „Ignis", 1999.- С. 203
6. Giddens A. *Nowoczesność i tożsamość: „Ja" i społeczeństwo w epoce późnej nowoczesności*.- Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN, 2001.- С. 142.
7. Krawczyk Z. *Kultura fizyczna a styl życia* // Styl życia a zdrowie: Dylematy teorii i praktyki / Ред. Z. Czaplicki, W. Muzyka.- Olsztyn: Polskie Towarzystwo Pedagogiczne, 1995.- С. 10.
8. *Ciało i zdrowie w społeczeństwie konsumpcji* / Ред. Z. Melosik.- Toruń; Poznań: Wydawnictwo EDYTOR, 1999.- С. 158.
9. Veblen T. *Teoria klasy próżniaczej*.- Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1971.- С. 218-243.
10. Melosik Z. *Ponowoczesny świat konsumpcji* // Ciało i zdrowie w społeczeństwie konsumpcji / Ред. Z. Melosik.- Toruń; Poznań: Wydawnictwo EDYTOR.- 1999.- С. 89.
11. Drabik J. Aktywność fizyczna w edukacji zdrowotnej społeczeństwa.- Gdańsk: Akademia Wychowania Fizycznego, 1995.- Cz.1.
12. Roman E. *Kulturowe wzory zachowań zdrowotnych jako efekt procesu socjalizacji młodzieży* // Forum Oświatowe.- 1994.- № l.- С. 215.


УДК 101.8:796.071.5.073

***Люкевіч У.П.***

## СПОРТ У КУЛЬТУРЫ СУЧАСНАГА ГРАМАДСТВА

Імклівыя змены, якія адбываюцца ў культуры сучаснага грамадства, не маглі не закрануць такую важную яго галіну як спорт. Словазлучэнне "спартыўная культура" зараз стала даволі звычайным, яно часта ўжываецца ў розных спалучэннях тэрмінаў "спорт" і "культура". Тут размова ідзе не толькі пра спартыўную культуру, але і пра культуру вялікага спорту, масавую спартыўную культуру, школьную спартыўную культуру, альтэрнатыўную спартыўную культуру альбо яшчэ больш спецыяльна пра футбольную кулыуру і культуру бегу. Тым самым спартыўная культура стала ўсеагульным абазначэннем разнастайных абласцей, станаў і формаў выразу спорта, і належыць як да такога спорту, якім займаюцца ў задзіночаннях і саюзах, у школах і другіх навучальных установах, так і да шырока распаўсюджаных формаў заняткаў спортам, якія прапануюцца прафесійнымі ўстановамі, народнымі ўніверсітэтамі, рэабілітацыйнымі цэнтрамі, рэгіянальнымі і нацыянальнымі традыцыямі і г.д. Спартыўныя праграмы mass media арыентуюцца на забаву і прапановы цікава правесці вольны час. У гэтым дачыненні маюць сэнс шматлікія

***Люкевіч Уладзімер Паўлавіч****, загадчык кафедры культуралогіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.*
*Беларусь, БрДУ, 224665, г. Брэст, бул. Касманаўтаў 21.*

індывідуальныя заняткі спортам як частка спартыўнае культуры.

З пазіцыяў сённяшняй рэчаіснасці гэтае звычайнае ўжо прымяненне паняцця спорт у судачыненні да культуры ў пэўнай меры з'яўляецца новым, таму што класічнае паняцце "культура" выключыла спорт з межаў сваіх абшараў. Але ў кожным выпадку, як і раней, застаюцца адрозненні паміж адзінкавымі абласцямі культуры. З аднаго боку, знаходзяцца сферы, якія маюць традыцыйную арыентацыю на культурныя вартасці: тэатр, літаратура альбо мастацтва; з другога, - навейшыя паняцці, такія, як: эканоміка, палітыка, сродкі масавай інфармацыі, а таксама спорт, культурную вартасць якога хутчэй аспрэчваюць, чым прызнаюць.

Калі болып дакладна разглядзець прымяненне тэрміна "культура" у спалучэнні са спортам, то ўвогуле застануць бачныя глыбокія змены. Яны датычацца пераменаў у разуменні культуры, якая стала болып шырокай, менш выразна акрэсленай і менш нарматыўнай. таксама як і змены ў сэнсе ўспрымання і разумення спорту. У сувязі з гэтым трэба падкрэсліць той факт, што карэнным чынам памяняліся судачыненні культуры і спорту, і спорт, - пасля таго, як паняцце культуры пэўным чынам размылася і страціла сваю нарматыўную арыентацыю, - вымушаны абыходзіцца сваімі ўласнымі нарматыўнымі сэнсаўтваральнымі патэнцыямі. У гэтым дачыненні этыка і мараль з'яўляюцца ядром альбо падмуркам і неабходнай умовай спартыўнай культуры, гэта датычыцца ў аднолькавай ступені тых установаў і аргапізацыяў, якія іх стабілізуюць у рамках іх адпаведнай кампетэнцыі.

Калі зрабіць рэтраспектыўны аналіз судачыненняў спорту і культуры, то гістарычна можна вызначыць дзве розныя лініі аргументацыі і ацэнкі.

Адна лінія аргументацыі арыентуецца на тое, каб не прызнаваць за спортам ягонай культурнай вартасці. Яна ўласна з'явілася са сферы фізічных практыкаванняў, і была спароджаная пабоpнікамі класічнага разумення культуры. Напрыклад, яшчэ ў "Новым гімнастыганым штогодніку" з 1885 года спорт быў названы. "культурай анальнай адтуліны". Х.Штайніцэр у кнізе з загалоўкам "Спорт і культура" [гл.: Steinitzer H., 1910, з.і 1-17] аспрэчыў здольнасць спорту мець усялякую культурную вартасць: спорт чужы сацыяльнаму ідэалу культуры, а для індывідуалістычнага ідэала ён не мце аніякага значэння, а заняткі спортам ёсць сімптомам заняпаду.

Ва ўсім гэтым праяўляецца такое ўспрыманне спорту, якое доўжылася стагоддзямі і якое дапускае, што спорт не ёсць дасягненнем культуры, а з'яўляецца прыкметай культурнага заняпаду. Згодна з такой трактоўкай, культура ёсць нечым больш высокім, чым спорт. Культурай валодаюць найперш "тыя, хто зверху", "адукаваныя". Яны таксама вызначаюць, што павінна знаходзіцца ў межах паняцця "культура". "Неадукаваны" спорт, які прыйшоў у кантынентальную Еўропу з Англіі ў другой палове XIX стагоддзя, і які стау хутка распаўсюджвацца, - перад усім сярод моладзі, - праз фізічныя практыкаванні атрымаў немалую папулярнасць у розных сацыяльных колах, і тым самым пачаў прэтэндаваць на ўспрыманне сваёй культурнай вартасці. Разуменне культуры, якое стаіць за такім адмаўленнем, можна назваць нарматыўным. Яно мае ацэначны характар і грунтуецца на пэўных уяўленнях аб нормах.

Спорт у сваім імкненні быць прызнаным як каштоўнасць культуры і адукацыі і, адпаведна, неабходнай часткай выхавання і школы, як акадэмічны прадмет, але разам з тым і як прадмет пісьменніцкага і мастацкага ўвасаблення, - зноў і зноў супрацьпастаўляецца з прыведзеным раней падыходам, што культура павінна мець справу з тонкай матэрыяй тэатру, літаратуры і паэзіі, музыкі і мастацтва. Згодна з такім разуменнем, у абшар культуры ўваходзіў той, хто валодаў гэтымі тыпамі культурных каштоўнасцяў, але зусім не той, хто цікавіўся спортам альбо актыўна ім займаўся. Такія адносіны да спорту да гэтага часу пераважаюць на Беларусі.

Прадстаўнікі спорту ніяк не хацелі пагаджацца з такім становішчам. Таму яны на працягу амаль стагоддзя абараняліся супраць такога падыходу да спорту, які, на іх думку, абясцэньваў спорт, і намагаліся, каб за ім быў прызнаны статус склададыіка культуры. Гэта павінна было мецца на ўвазе не толькі як ідэальная велічыня, але і павінна было служыць паляпшэнню рэнамэ спорту ў грамадскай думцы. Пры гэтым нарматыўнае разуменне культуры паварочвалася ў бок спорту. Увага тых, хто адмаўляў спорту ў кулыурнай значнасці, звярталася на значэнне фізічных практыкаванняў у гісторыі і культуры многіх народаў, - перад усім у грэцкай культуры, - на раскрыццё гэтай тэмы ў паэзіі, літаратуры, музыцы і на высокую ацэнку, якую давалі спорту вялікія педагогі і лекары. Той, хто не залічвае спорт да культуры. абвяшчаецца асобай, якая сама мае недахоп культуры.

Абодва падыходы маюць тое адзінства, што яны кіруюцца традыцыйным нарматыўным разуменнем культуры. Спорт, які з пазіцыі ўласнай самадастатковасці абараняўся супраць такога становішча ў культуры, якая выключала яго, у той жа самы час хацеў дзеля сваёй рэпутацыі адпавядаць крытэрыям той канцэпцыі культуры, якая адмаўляла яму ў прызнанні.

У працоўным руху рабочы спорт разумеўся выключна як частка культуры гэтага сацыяльнага слою. У сацыялістычным грамадстве фізкультуру належала не адасабляць і дыскрымінаваць, а трэба было зрабіць яе важным складальнікам культурнага, школьнага і акадэмічнага жыцця.

Разуменне культуры і спорту за апошнія дзесяцігоддзі глыбока памянялася. Культура гэта ўсё, і ўсё гэта культура, як вызначае Х.Баўзінгер [гл.: Bausinger H. 1994, s.41-50]. Зараз культура наўрад ці яшчэ ўспрымаецца нарматыўна. Цэласнага разумення культуры больш няма. Яна страціла сваю сілу як лейтматыў для індывідуальнага і грамадскага жыцця. Культура ператварылася ў дыфузную "фонавую велічыню" [гл.: Neidhardt F., 1986, s.7-17]. Паняцце культуры на сёння мае шмат значэнняў: ад культуры клеркаў і бараў да маладзёвай, джынсавай культуры і культуры хуткага харчавання. Культура не замкнутая больш на сябе, яна распадаецца на размаітыя частковыя культуры, якія не адпавядаюць больш адзіным сэнсавым узорам і дамінантным арыентацыям на каштоўнасці, а ўзнікаюць пераважна ўнутрана праз спецыфічныя сэнсавыя ўзаемазалежнасці і гэтым дасягаюць свайго большага ці меншага ўнутранага адзінства. Спорт таксама лічыцца такой вось частковай культурай.

Між тым унутры такіх частковых культураў нярэдка ўтвараюцца субкультуры, якія зноў-такі забяспечваюць сябе з дапамогай спецыфічных сэнсавых узораў, відаў ментальнасці, узораў паводзінаў і сімвалаў, формы адмежавання звонку і формы злучэння знутры, Гэта ж самае з'яўляецца характэрным для спартыўнай культуры: футбольныя фаны, англійскія рэгбісты, згуртаванні стаераў, сэрферы і сноўбордэры ствараюць сабе ўласныя субкультуры і субкультурныя сцэны. Культура ў старым нарматыўным сэнсе, з аднаго боку, згладзілася, а з другога, - стала шмат больш разнастайнай. Гэта выяўляецца ў развіцці і тлумачыцца станаўленнем аднаформнай міжнароднай культуры mass media, адначасовым ростам культурнай размаітасці. Адсутнасць дакладнасці вызначэння культуры і своеасаблівая інтэрпрэтацыя амаль ва ўсіх сферах абласцей чалавечага жыцця ўключае ў сябе жорсткасць, дурноты і банальнасці гэтаксама, як і выдатныя эстэтычныя дасягненні і маральныя ўзоры.

У такім супярэчлівым сэнсе спорт стаў часткай культуры, але не таму. што падняўся да культурнай каштоўнасці ў нарматыўна-культурным сэнсе, а таму што, з аднаго боку, - развілася другое разуменне культуры, а з другога, - спорт здабыў ранг складальніка культуры, якая разумеецца не так,

як раней. Тут не апошнюю ролю адгульвае ўзрастанне эканамічнага і медыяльнага значэння спорту.

Змены, якія між тым наступілі, не прывялі да таго, што традыцыйная бездань паміж спортам і культурай была пераадоленая на самой справе. У штодзённых газетах ёсць рубрыка культуры і рубрыка спорту. Студыі радыё і тэлебачання маюць рэдакцыі культуры і спорту, у адміністрацыях гарадоў ёсць функцыянеры культуры і інструктары спорту. Дзяленне паміж культурай і спортам паўстае як выразна глыбокае і доўгатэрміновае.

За апошнія дзесяцігоддзі спорт змяніўся не толькі колькасна, але і якасна: ёсць больш удзельнікаў і ўдзельніцаў, большыя колькасці гледачоў, побач з класічным наборам задзіночанняў ёсць задзіночанні спартыўна-прамысловай інфраструктуры. Да гэтага ж далучаецца і рост індывідуальнага трэнінгу. Спорт існуе ў шматлікіх формах і праявах, успрыманне і разуменне якіх займае ўжо абшар ад яго класічных відаў да прагулак. кашэння газонаў і вандровак. Побач са спортам, што арганізаваны ў задзіночаннях і саюзах, паўстала спартыўная культура, якая адрозніваецца ад класічнага разумення спорту, і часткова нават выразна супрацьстаіць яму як альтэрнатыўная.

Памянялася і матывацыя дзеля таго, каб актыўна займацца спортам. "Спартыўнасць" для многіх людзей стала важным узорам для пераймання. Гэтая спартыўнасць больш не з'яўляецца справай толькі актыўных спартоўцаў. Яна навогул стала складальнікам індывідуальшх стыляў жыцця і тым самым асноўным узорам штодзённай культуры [гл.: Kaschuba W., 1989, s.154-172]. Яна распаўсюджваецца на многія вобласці жыцця, на сацыяльныя слаі і ўзроставыя прыступкі, на якіх найперш канцэнтраваўся класічны спорт, - перадусім на моладзь і генерацыю сярэдпяга ўзросту (пераважна мужчынаў). Тым самым спорт ператвараецца ў сацыяльны і культурны кантэкст, які датычыць усіх, а не толькі тых, хто актыўна займаецца спортам. Яго ўплыў адчуваюць на сабе нават тыя, хто пазбаўляе сябе заняткаў спортам. Для многіх сёння галоўным з'яўляюцца не дасягненні, трэніроўкі, fairness, спаборніцтвы і камандны дух, а яшчэ іншае, тое, што яны шукаюць і знаходзяць у спорце, а менавіта: цялеснае дасведчанне, эстэтыка цела, добрае самаадчуванне, авантуры, забава і добры гумар. Побач з класічным этасам дасягненняў паўстае этас эстэтычнага і прывабнага знешняга выгляду.

Старая "спартыўнасць" доўгі час была абмежаваным, наглядным, але і зручным узорам для культуры задзіночанняў, і абапіраліся перад усім на тых, хто быў звязаны з гэтай культурай. Сёння можна быць "спартыўным" і не быць спартоўцам, можна не займацца спортам "па-сапраўднаму". Тым самым класічны матыў "спартыўнасці" губляе чысціню профілю, а спартыўны этас - сваю зручнасць.

Штодзённасць ва ўспрыманні сучаснага чалавека часамі дражніць, нудзіць і нервуе. Адзін дзень падобны на другі. Грамадства ў цэлым выглядае падобным на супольнасць людзей, якія імкнуцца нешта дасягнуць, але ў выніку жорсткай канкурэнцыі ўсё болыл сутыкаюцца з цывілізацыйнымі стрэсамі. Такім чьшам, адносіны да спорту пачынаюць успрымацца ў іншым кантэксце, а дакладней, - як амаль што адзінае выратаванне ад бесперапынных вымаганняў і цяжару навакольнага асяроддзя [гл.: Trembaczowski A., 1998].

Такое развіццё грунтуецца на такім разуменні культуры, якое сягае за класічныя культурныя каштоўнасці і часта з'яўляецца спецыфічна-групавым, модным, эстэтызаваным і сцэнаўтваральным у сацыяльным сэнсе. Новае разуменне культуры хоць і належыць да ўсіх сфераў жыцця, але не з'яўляецца больш абавязкова арыентаваным. У дадзеным кантэксце культура наўрад ці разумеецца больш як задача. Калі гэты працэс назваць "спартывізацыяй" нашай культуры, то ёй адпавядае свайго роду "дэспартывізацыя", што да гэтага разумелася і ўспрымалася як спорт. Адназначнасць класічнага разумення спорту страчана, здаецца, канчаткова, аколішнія спартыўна-этычныя прынцыпы становяцца невыразнымі.

Працэсы культурных зменаў не з'яўляюцца нечым незвычайным. У распаўсюджаных формах індывідуалізацыі ў спорце і паняцці "новая спартыўнасць" адбівагоцца жыццёвыя мроі і ўяўленні многіх людзей, а таксама шмат якія дэфіцыты духоўнай сферы, якія яны адчуваюць у дачыненні да свайго цела, Тым самым паўстае пытанне: як можна перад абліччам такіх зменаў адрозніваць лепшы від спорту ад менш вартага? Потым, адкуль узяць маштаб, каб адрозніваць паміж сабой спорт на ўзроўні fair play і спорт на ўзроўні foul play, неэстэтычныя спартыўныя паводзіны, асудзіць маніпуляцыі спартыўнымі дасягненнямі, допінг, гвалт, камерцыялізацыю спорту і незацугляныя спартыўныя ідэалогіі поспеху? У такіх ацэнках маюцца, хоць часта ў прыхаваным і нераскрытым дыскусійна выглядзе, уяўленні пра вартасці. Толькі яны даюць магчымасць перад абліччам неабдымнасці спорту вымераць усялякую практыку спорту строгай велічынёй вартасці і прадпрымаць намаганні дзеля яе рэалізацыі, каб, такім чынам, убачыць спорт не як адвольную частку культурнага жыцця, а разглядзець ягоныя станаўленне і культыванне [гл.: Schloz R., 1992], а саму культуру як формавую і структурную зададзенасць культурнага жыцця.

Але пры гэтым вызначэнне маштабаў культывавання спартыўнай культуры нельга больш выводзіць з культуры як велічыні болып высокага парадку. Культурную важкасць спорту трэба вызначаць найперш з ягонай уласнай ідэі і ягоных уласных магчымасцяў і вымяраць тым, наколькі ўдаецца іх выявіць. Аднак, - і гэта з'яўляецца наступствам тае абставіны, што больш няма значэннетворчай і значэннетрансфарматыўнай інстанцыі, а плюралізм стаў лёсам спорту, -існуюць розныя пазіцыі. Правільную няпроста вызначыць з-за адсутнасці агульнапрынятай шкалы значэнняў, і яе трэба выводзіць у дыскусіях і дыскурсе ў спорце, прычым размова ідзе пра тое, каб вызначыць сэнс спорту з падыходаў выхавання, здароўя, fair play і этыкі. Гэтаму супрацьстаіць падлеглы інфляцыі ўжытак паняцця культуры як выразу страты ў культуры адназначнай шкалы значэнняў. Новая ўстаноўка значэнняў хоць і прымае ў разлік культурную плюралізацыю і індывідуалізацыю, але павінна супрацьпаставіць ім імкненне захаваць адзінства асобы перад абліччам новай разнастайнасці. Пры гэтым важнымі ттерадумовамі з'яўляюцца этыка і мараль як аснова і ўмова культуры, а тым самым і акцэптаванне агульных вартасцяў як цэлага, годнасці асобы, а таксама такіх спартыўна-спецыфічных вартасцяў, як fairness, здароўе, негвалтоўнасць, поспех і ўмеласць.

## СПІС ВЫКАРАСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Bausinger H. Wir Kleinburger. Die Unterwanderung der Kultur // Pfeiffer J., Fichter G. Erlebte Geschichte. - Tubingen, 1994. - S.41-50.
2. Kaschuba W. Spotivitat: Die Karriere eines neuen Leitwertea // Sportwissenscaft. - 1989. - №19. - S.154-172.
3. Neidhardt F. u.a. (Hrsg.). Kultur und Gesellschaft. Kolner Zeitschrift fur Soziologie Sozialpsycho1ogie. Sonderheft 27. - Opladtn, 1986. - S.7-17.
4. Schloz R. Religionskultur und Sportkultur - Zur Pflege von Religion und Sport in der zierten Gesellschaft // Kirche und Sport: Unsere Zeit in Gottes Handen. - Hannover, 1992. - S.16-29.
5. Steinitzer H. Spory und Kultur. Mit besonderer Berucksichtigung des Bergsports. - Munchen, 1910. - S.11-17.
6. Trembaczowski A. Zanim wyruszysz czyli cos o survivalu. - Warszawa, 1998. - 116 s.